


### *На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь*

# ДАРЫЦЬ РАДАСЦЬ І НЕПАКОІЦЬ СЭРЦА

У жыцці кожнага чалавека спрадвеку існуюць паняцці, без якіх губляецца сэнс чалавечага быцця. Што робіць існаванне індывіда чалавечым жыццём? Як спасцігнуць і стварыць у сваім жыцці ісціну, дабро, прыгажосць, годнасць, сумленне, любоў, і, галоўнае, не страціць іх на працягу жыцця? Складанасць і драматызм быцця змешваюць і часта робяць адноснымі святое і грэшнае, узнёслае і ганебнае. Адзін і той жа чалавек можа быць не толькі высакародным і сумленным, але і прыносіць іншым пакуты. Можа любіць і можа ненавідзець. Гэта ўсё — рэальнае жыццё, і невыпадкова чалавецтва ўвесь час ставіць перад сабой адны і тыя ж пытанні. Што такое чалавек? Дзеля чаго ён жыве на зямлі? Што такое дабро і зло?

На працягу тысячагоддзяў на гэтыя і іншыя пытанні адказвалі філосафы, тэолагі, гісторыкі, юрысты, педагогі... Заўсёды побач з імі быў Мастак — Творца. Ва ўсе часы ён выконваў адну з галоўных роляў у духоўных пошуках людзей, імкнуўся даць свае адказы на спрадвечныя пытанні, растрывожыць чалавечую душу, паказаць праблемы і клопаты свайго часу. Сапраўдны мастак сваёй творчасцю абуджае сумленне, выклікае ў душы пачуцці ўзнёсласці і захаплення...

Менавіта такія думкі і пачуцці прыходзяць пры чытанні твораў Міхася Башлакова — паэта шчырага, выразнага, эмацыянальна-ўзвышанага. У яго выйшла дзесяць кніг паэзіі, сярод якіх "Пяро зязюлі падніму" і "Нетры" прыкметна вылучаюцца не толькі ў творчасці паэта, але і ў сучаснай беларускай літаратуры наогул. І зусім невыпадкова, што менавіта гэтыя кнігі вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за 2006 год.

Паэзія не можа існаваць без адпаведнага душэўнага настрою аўтара, што ў сваю чаргу патрабуе надзвычайнай абвостранасці пачуццяў, шчырасці і грамадзянскага сумлення. Адзін з сакрэтаў таленту Міхася Башлакова — у жывой арганічнай сувязі лёсу паэта з лёсам Радзімы. Ягоная паэзія — гэта перш за ўсё любоў да свайго народа, да някідкай прыгажосці палескіх краявідаў. Аднак патрыятызм паэта праяўляецца не толькі ў прачулай любові да роднай прыроды. Яго душу вярэдзяць усе праблемы, трывогі і боль сучаснага грамадства.

Адметнасць паэзіі М. Башлакова — у майстэрскім валоданні словам і рытмам. Розныя вершаваныя памеры дазваляюць адлюстроўваць багатую палітру пачуццяў, ствараць у паэзіі сапраўдныя музычныя творы, якія гучаць поліфанічна. Пры гэтым максімальная канцэнтрацыя энергіі адбываецца пры мінімальнай затраце слоў:

*Птушка крычыць*
*У ранішнім лесе*
*Пранізліва, тонка,*
*Птушка крычыць...*
*Мо ў драпежных*
*Крычыць кіпцюрах?*
*Нібы крывёю,*
*Рабіны*
*Пунсовыя гронкі*
*Пырснулі ўслед...*

*І душу*
*Агарнуў маю страх...*

Асобна хочацца адзначыць насычанасць ягонай паэзіі сімволікай. Бусел, дарога, крыжы-абярэгі, лістапад, вецер, рака, вогнішча — гэтыя і іншыя словы-паняцці, словы-сімвалы выступаюць у цеснай сувязі з душэўным станам аўтара, уплываюць на стан ягонай душы і ідэю твора.

Калі пагартаць ранейшыя ягоныя зборнікі, то можна заўважыць у вершаваных радках 1970-х гадоў больш узнёсласці, сентыментальнасці, лірызму і радасці жыцця. Там яшчэ няма такой разнастайнасці ў рытміцы і такога шырокага дыяпазону пачуццяў. У 1980—1990-х гадах склад вершаў значна ўзбагачаецца, змяняецца ўспрыманне жыцця, з'яўляюцца філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці, боль, трывога і нават адчай. У кнігах "Пяро зязюлі падніму" (2001) і "Нетры" (2004) талент Міхася Башлакова дасягае росквіту і сталасці. І асабліва гэта тычыцца ягонай паэмы "Лілея на цёмнай вадзе" — твора сапраўды унікальнага, унікальнага па ступені душэўнай напружанасці, трагізму, грамадзянскай пазіцыі аўтара, маштабнасці і дасканаласці паэтычнай будовы.

Пра што гэта паэма? Пра родную зямлю, яе мінулае і сучаснасць, пра нас усіх і кожнага паасобку, пра нашу душу, культуру, гістарычную памяць, сумленне, родную мову, пра наша жыццё да і пасля Чарнобыля...

Гэты твор — у пэўным сэнсе, "энцыклапедыя жыцця" нашай Радзімы, па аналогіі з тым, як у свой час "Яўгеній Анегін" быў названы "энцыклапедыяй рускага жыцця". Але "Лілея на цемнай вадзе" — паэма-рэквіем, працятая болем і роздумам аб лёсе Айчыны. Паэт хвалюецца і перажывае за лёс роднай зямлі і сваіх суайчыннікаў, трывожыць іх душы, абуджае годнасць, чалавечнасць, грамадзянскія пачуцці:

*Раўнадушша пячаць*
*З душ людскіх,*
*Мае песні,*
*Сарвіце...*
*І пакуль сорам ваш,*
*Як ачаг,*
*Не ачах,*
*Вы на стол іх,*
*Як хлеб,*
*Пакладзіце...*

Але, нягледзячы на боль, адчай і смутак, паэзія Міхася Башлакова дорыць нам надзею — апошняе, і, можа, самае важнае, тое, чым жыве чалавек. Лілея ў паэта — сімвал Радзімы, сімвал Надзеі.

Паэзія Міхася Башлакова — гэта на самай справе Паэзія з вялікай літары. Таму што яна прымушае нас шукаць адказы на спрадвечныя пытанні, трывожыць душу і сумленне. Яна, нібы кветка лілея, што вылучаецца сваёй бялюткай чысцінёй на цёмнай гладзі вады, прыносіць людзям радасць і дорыць спадзяванне. Што ж, будзем радавацца і спадзявацца. Будзем чакаць ад паэта новых твораў, шчырых і праўдзівых, вытанчаных і ўзнёслых.

**Ларыса ЛЯХОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ